УДК 811.161.3’27

**Т.А. Кісель**
*канд. філал. навук, дац. каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: kisel-ts@mail.ru

# ВАРЫЯНТНАСЦЬ ЗАХОДНЕПАЛЕСКІХ НАМІНАЦЫЙ РАСЛІН

*Разглядаюцца розныя падыходы да вызначэння паняццяў варыянтнасці, сінаніміі і дублетнасці ў сучасным беларускім моваазнаўстве. З’ява варыянтнасці прааналізавана на прыкладзе заходнепалескіх намінацый раслін і выяўлены магчымыя прычыны яе ўзнікнення. У заходнепалескіх гаворках зафіксаваны фанетычныя, акцэнтныя, акцэнтна-фанематычныя, марфалагічныя, фанетыка-марфалагічныя і слова-ўтваральныя варыянты батанічных назваў, прыведзены шматлікія прыклады. Асаблівай прадуктыўнасцю сярод прааналізаваных адзінак вызначаецца фанетычная варыянтнасць.*

## Уводзіны

Лексіка-семантычныя з’явы, такія як сінанімія, дублетнасць, аманімія і варыянтнасць, адначаюцца ў розных тэматычных групах дыялектнай мовы. Характэрныя яны і для заходнепалескіх намінацый раслін. Асабліва шырока прадстаўлена ў дадзенай групе з’ява варыянтнасці.

Пытанне пра суадносіны з’яў варыянтнасці, сінаніміі і дублетнасці і сёння застаецца ў навуцы складаным і супярэчлівым. У беларускай лінгвістыцы да праблем размежавання гэтых паняццяў звярталіся Я. Абрамава [1], В. Красней [2], І. Шкраба [3], Т. Юхо [4; 5] і іншыя даследчыкі. Мы раздзяляем пункт погляду В. Краснея адносна дадзенай праблемы і адрозніваем «тэрміны-сінонімы, якія характарызуюцца тым, што сваім унутраным зместам адлюстроўваюць розныя кваліфікацыйныя прыметы паняцця, напрыклад, *грань – сценка, зыход – вынік, уводзіны – уступ* і да т.п. Тэрміны-дублеты ў сваім паняційным змесце не маюць ніякіх сэнсавых адрозненняў, напрыклад, *асіміляцыя – прыпадабненне, бок – старана* і да т.п. Яны характарызуюцца тым, што суадносяцца з адным і тым жа навуковым паняццем, а ва ўзаемаадносінах паміж сабой не выражаюць ніякіх сэнсавых адценняў, г.зн. вызначаюцца гранічнай семантычнай раўназначнасцю. Абумоўлена гэта тым, што ў такіх полінайменных радах уласны і запазычаны тэрміны маюць аднолькавую ўнутраную матывіроўку» [2, с. 25–26].

Пад *варыянтнасцю* мы разумеем такую з’яву, калі для абазначэння аднаго і таго ж паняцця выкарыстоўваюцца розныя варыянты адной і той жа назвы пры захаванні сематычнай тоеснасці лексемы: «Варыянтамі з’яўляюцца разнавіднасці таго самага тэрміна, якія адрозніваюцца паміж сабой фанетычнымі і словаўтваральнымі элементамі ці сродкамі выражэння граматычных значэнняў, але не маюць ніякіх семантычных адценняў і поўнасцю супадаюць сваім значэннем» [2, с. 27]. Як адзначае Л.А. Булахоўскі, «да варыянтаў адносяцца семантычна раўназначныя і часткова адрозныя ў матэрыяльным аспекце словы» [6, с. 134]. Розныя знешнія відазмяненні слоў не парушаюць тоеснасці слова, «у межах варыянтаў слова застаецца само сабой» [7, с. 17].

У заходнепалескай батанічнай наменклатуры намі зафіксаваны і прааналізаваны больш як 2 100 адпаведнікаў да назваў разнастайных раслін і адзначаны фанетычныя, акцэнтныя, акцэнтна-фанематычныя, марфалагічныя, фанетыка-марфалагічныя і словаўтваральныя варыянты.

Мэта працы – прааналізаваць разнастайныя тыпы варыянтных назваў раслін у заходнепалескіх гаворках і выявіць магчымыя прычыны іх узнікнення.

**Асноўныя тыпы варыянтнасці заходнепалескіх намінацый раслін**

Найбольшую ў колькасных адносінах групу складаюць ***фанетычныя*** варыянты – відазмяненні гукавога саставу слова, адрозненні ў саставе фанем, не звязаныя з марфалагічнымі чаргаваннямі і парадыгматычнымі зменамі слова [7, с. 17].

Фанетычныя варыянты могуць адрозніваццa паміж сабой як галоснымі гукамі асновы ([а] / [э]: *ва́рус – вэ́рус, горчя́к – горче́к, каля́ндра – кале́ндра, е́талына – е́тэлына, ладю́х – лэдю́х, лапэ́ха – лэпэ́ха*; [а] / [о]: *бальса́н – бальсо́н, костэра́ва – костыро́ва, аве̋с – ове̋с, адува́нчык – одува́нчык, наготкы́ – ноготкы́, орабы́на – оробы́на, паву́тка – пову́тка, панаві́я – панові́я*; [і] / [э]: *аргі́ня – арге́ня, бі́лые подсне́жнікі – бе́лые подсне́жнікі, біро́за – беро́за, вінге́ркі – венге́ркі, звірабо́й – зверабо́й;* [а] / [у]: *жабарэ́нне – жабурэ́нне, крывавнэ́к – крэвувнэ́к, падаро́жнік – пудуро́жнік, парэ́чкі – пурэ́чкі*; [а] / [ы]: *хвошча́нка – хвошчы́нка, варба́ – вырба́, саду́н – сыду́н, сачавы́ца – сачывы́ца, сварі́па – свырі́па*; [ы] / [э]: *бруснэ́ці – брусны́ці, вульшы́на – вульшэ́на, вы́шня – вэ́шня, гарабы́на – гарабэ́на*; [о] / [у]: *баго́ннык – багу́ннык, бобо́внык – бобу́внык, коко́ль – коку́ль, моро́г – мору́г, сосо́нка – сосу́нка, тро́йнык – тру́йнык, хво́йка – хву́йка*; [а] / [о] / [у]: *бага́н – баго́н – багу́н, ажы́ны – ожы́ны – ужы́ны, гаро́х – горо́х – гуро́х),* так і зычнымі ([в], [в’] / [ў]: *анто́новка – анто́ноўка, крывавні́к – крываўні́к, ля́скавка – ля́скаўка, ове̋с – оўе̋с*; [д] / [т]: *друста́в-кэ – труска́вкы, кардо́пля – карто́пля*; [п] / [ф] / [х]: *карто́плі – карто́флі, карто́пля – карто́фля – карто́хля*; [л] / [л’]: *блэ́кут – бле́кут, клэн – клен, ладю́х – лядю́х, лэ́па – ле́па*; [н] / [н’]: *дува́нчыкі – дува́ньчыкі, кі́нскі шчаву́х – кі́ньскі шчаву́х, кмін – кмінь, нэзабу́дка – незабу́дка, полы́н – полы́нь люцэ́рна – люцэ́рня*; [р] / [р’]: *грэ́чэчка – гре́чечка, пірэ́й – піре́й, соко́р – соко́рь, чэбрэ́ць – чэбре́ць*; [с] / [с’]: *квасэ́ц – квасе́ц, я́сэнь – я́сень*; [ц] / [ц’]: *горчі́ца – горчі́ця, кропэ́ц – кро́пэць, мокрэ́ц – мокрэ́ць, мэтлы́ца – мэтлы́ця, пшэні́ца – пшэні́ця* і інш.).

Сярод фанетычных варыянтаў дадзенай групы найбольшай прадуктыўнасцю вызначаюцца варыянтныя пары намінацый з чаргаваннямі [ы] / [э] – 90 выпадкаў, [о] / [у] – 51 выпадак, [а] / [о] – 51 выпадак, [а] / [э] – 33 выпадкі, [і] / [э] – 29 выпадкаў. Сярод фанетычных варыянтаў, якія адрозніваюцца паміж сабой зычнымі гукамі, найбольш пашыраны назвы з чаргаваннямі [в] / [ў] – 20 выпадкаў, а таксама з чаргаваннямі цвёрдых і мяккіх зычных: [ц] / [ц’] – 17 выпадкаў, [н] / [н’] – 14 выпадкаў, [л] / [л’] – 12 выпадкаў.

Прадуктыўнасцю вызначаецца і група фанетычных варыянтаў, якія адрозніваюцца паміж сабой галоснымі і зычнымі асновы: [б’і] / [бу]; [б’і] / [бы] / [бэ]: *бобі́внык – бобу́внык, біб – быб, гарабі́на – гарабы́на, лыбіда́ – лыбыда́ – лібэда́*; [в’і] / [вэ]; [в’э] / [вы]: *ведме́дына – выдмэ́дына, лі́ствэніца – лі́ствініця – лы́ствэныця*; [ж’і] / [жы]: *ожі́на – ожы́на*; [з’э] / [зы]: *бызе́на – бызы́на*; [к’і] / [кы]: *брокі́ва – брукы́ва, кі́рза – кы́рза, кіяхі́ – кыяхы́, кокі́ль – кокы́л*; [н’а] / [ны]; [н’і] / [ны]: *спорня́к – спурны́к, ба́бнік – ба́бнык, баго́ннік – баго́ннык, блі́шнік – бло́шнык*; [с’і] / [сы]; [сы] / [с’э]: *васіле̋к – васыле̋к, осі́на – осы́на, сі́тнык – сы́тнык, сыду́нка – седу́нка*; [ф’і] / [фы]: *журафі́ны – журафы́ны* і інш.

Фанетычныя варыянты могуць адрозніваццa галоснымі ў канчатку ([а] / [э]: *жабурэ́ння – жабурэ́нне*; [і] / [э]: *буракі́ – бураке́, вовчакі́ – вовчаке́, грушкі́ – грушке́*; [ы] / [э]: *вовчкы́ – вовчкэ́, гарбузы́ – гарбузэ́, журахлэ́ны – журахлэ́нэ, лахачы́ – лахачэ́, суны́цы – сунэ́цэ, чо́рны я́годы – чо́рнэ я́годэ* і інш.) або апошняй зычнай асновы і галоснай у канчатку ([к’і] / [кы]: *бра́тыкі – бра́тыкы, буракі́ – буракы́, воўчкі́ – воўчкы́, гуркі́ – гуркы́, гу́скі – гу́скы*; [к’і] / [кэ]: *браткі́ – браткэ́, жы́дыкі – жы́дыкэ, одува́нчыкі – одува́нчыкэ*; [лі] / [лы]: *бе́лі налі́ў – бе́лы налі́ў*; [н’і] / [ны]: *ожы́ні – ожы́ны*; [ц’і] / [цэ]: *сунэ́цэ – сунэ́ці*; [х’і] / [хы]: *кіяхі́ – кыяхы́*; [ч’і] / [чы]: *лохачі́ – лохачы́, лухачі́ – лухачы́).*

Сярод назваў з чаргаваннямі ў канчатках найбольш пашыраны варыянты: [і] / [ы] – у 29 парах, [ы] / [э] – у 15 парах, [і] / [э] – у 10 парах.

Узнікненне фанетычных варыянтаў найчасцей звязана са з'явамі пратэзы: *ужы́на – вужы́на, усы́на – вусы́на, усука́ – вусука́, оле́шына – голе́шына, чарэ́т – учэрэ́т* і пад. (прычым у якасці пратэтычных гукаў часцей выступаюць зычныя); эпентэзы: *сырдэ́ля – свырдэ́ля, мя́та – мня́та, дросён – дросте́н, ко́ткы – ко́тыкы, тэ́рн – тэ́рын* і інш. (у якасці эпентэтычных часцей фіксуюцца таксама зычныя гукі); асіміляцыі: *ба́бка – ба́пка, жы́жка – жы́шка, жасмі́н – жасьмі́н* і інш.; метатэзы: *кропы́ва – прокы́ва, кропыва́ – прокыва́, мыдвэ́дына – выдмэ́дына*. Менш пашыраны з'явы аферэзіса (*алыча́ – лыча́, гера́нь – іра́нь, глэ́снык – лэ́снык, осока́ – сока́*) і дысіміляцыі: *лата́тьте – лока́тьте*.

Фанетычная варыянтнасць батанічных номенаў абумоўлена такімі асаблівасцямі заходнепалескіх гаворак, як оканне (*лоза́, осоко́р, подоро́жнык, сосо́нка* і інш.), вымаўленне на месцы *h* пад націскам галоснага [*і*] (*бі́лы налі́ў, позімкі, хміль* і інш.), цвёрдасць заднеязычных у спалучэннях *гы, кы, хы* (*бра́тыкы, кыяхы́, лохы́ны, слывкы́* і інш.), цвёрдасць губных і пярэднеязычных перад этымалагічнымі [э], [*і*] (*быро́за, гарабы́на, дывына́, лыбыда́* і інш.), наяўнасць мяккіх этымалагічных шыпячых (*горчі́ця, лохачі́, ожі́на, чірі́т* і інш.), [*р'*] (*окрі́п, різа́к, спорі́ш, чырі́шня* і інш.), [*в*] на месцы [*ў*], якое адзначаецца ў літаратурнай мове (*морко́внік, слівкі́, труска́вкы* і інш.), адсутнасць дзекання і цекання (*лота́ть, лю́тік, сморо́діна, тютю́н* і інш.) і інш.

Акцэнталагічная неаднароднасць народна-дыялектнай лексікі садзейнічае ўзнікненню ў заходнепалескіх гаворках шматлікіх ***акцэнтных*** (ідазмяненні слова, якія адрозніваюцца толькі націскам [7, с. 17]): *бра́ткі – браткі́, ву́льха – вульха́, кі́рза – кірза́, коку́ль – ко́куль, лі́лія – лілі́я, лэпэ́ха – лэпэха́, плоску́ха – плоскуха́, сі́тнык – сітны́к, соко́р – со́кор, сы́тнык – сытны́к, то́піль – топі́ль* – і ***акцэнтна-фанематычных*** варыянтаў (ідазмяненні, абумоўленыя камбінацыяй акцэнтных і фанетычных змен [7, с. 17]): *бобо́к – бо́бык, голе́шына – гольшы́на, жыдкэ́ – жы́дыкэ, ло́тать – лата́ць, оле́шына – ольшы́на, плышны́к – плэ́сняк,пе́пенка – піпі́нка, сі́ляга – сыля́га, чорноголо́в – чырнуго́лов, шчаве́й – шча́вій, ярэ́й – е́рый*.

Акцэнтная варыянтнасць зафіксавана ў 45 групах заходнепалескіх найменняў, акцэнтна-фанематычная – у 21 групе.

***Марфалагічная*** варыянтнасць (ідазмяненні, якія адрозніваюцца формамі роду ці ліку) назіраецца ў межах катэгорый роду (*лата́ть* м. – *лата́ть* ж., *піо́н* м. – *піо́на* ж., *полы́нь* м. – *полы́нь* ж., *цыко́рый* м. – *цыко́рыя* ж., *я́сэнь* м. – *я́сэно* н.; *лата́цце* н. – *лата́цця* ж.) і ліку (*брусні́ка – брусні́кі, выдмэ́дына – выдмэ́дыны, вы́шня – вышні́, гру́шка – грушкі́, гу́ска – гу́скі, попырі́вка – попырі́вкэ, порэ́чка кра́сна – порэ́чкі кра́сныя, сліпа́к – сліпакы́, слы́вка – слы́вкы́, язы́чок – язы́чкі)*.

***Фанетыка-марфалагічныя*** варыянты (ідазмяненні, абумоўленыя камбінацыяй марфалагічных і фанетычных змен) заходнепалескіх батанічных найменняў прадстаўлены наступнымі парамі: *ло́тас* м. – *ло́тась* ж., *лэ́пэх – лэпэ́ха, мокрэ́ц – мокры́ца, подсо́лнух – пудсо́лнуха, чарэ́т – чаро́та* і інш.

У групе складаных батанічных намінацый вылучаюцца назвы з варыянтнымі формамі прыметнікаў – поўнай і кароткай: *лыча́ жо́вта – лыча́ жо́ўтая, по́зьня капу́ста – по́зная капу́ста, сморо́діна чо́рна – сморо́діна чо́рная, чо́рны я́годы – чо́рныя я́гады, чырво́ны буракы́ – чырво́ные буракы́*. У некаторых з гэтых найменняў назіраецца паралельна і фанетычная варыянтнасць: *по́зьня капу́ста – по́зная капу́ста* і пад.

Сярод марфалагічных варыянтаў батанічных намінацый пераважаюць чаргаванні назоўнікаў адзіночнага/множнага ліку (48 выпадкаў), варыянты назоўнікаў мужчынскага/жаночага роду (33 выпадкі). У групе фанетыка-марфалагічных варыянтаў колькасна вылучаюцца чаргаванні назоўнікаў мужчынскага/жаночага роду (27 выпадкаў) і варыянты назоўнікаў адзіночнага/множнага ліку (10 выпадкаў).

Спрэчным застаецца пытанне адносна размежавання ***словаўтваральных варыянтаў*** слова і аднакаранёвых сінонімаў. Як лічыць І. Шкраба, «уся складанасць пытання абумоўлена тым, што словаўтваральныя варыянты знаходзяцца на мяжы паміж лексічнымі і граматычнымі з'явамі, правесці ж выразнае размежаванне граматычнай і лексічнай семантыкі вельмі няпроста, тым больш што словаўтваральныя марфемы ў большай ці меншай ступені захоўваюць рэшткі лексічнай самастойнасці. Вось чаму аднясенне падобных з'яў да той ці іншай класіфікацыйнай рубрыкі часам носіць суб'ектыўны характар» [3, с. 81]. Пры гэтым некаторыя моваведы ўвогуле не вылучаюць словаўтваральную варыянтнасць і лічаць падобныя пары аднакарэннымі сінонімамі або паронімамі [7, с. 17–18]. У агульналітаратурнай мове, сапраўды, цяжка размежаваць варыянты слова і аднакаранёвыя словы-сінонімы.

На думку В. Краснея, «у межах батанічнай тэрміналагічнай лексікі існуюць аднакаранёвыя номены, якія адрозніваюцца паміж сабой асобнымі прыстаўкамі, суфіксамі, сродкамі выражэння граматычных значэнняў, але не маюць ніякіх семантычных адрозненняў, стылістычных і эмацыянальных адценняў, характарызуюцца аднолькавай спалучальнасцю з іншымі словамі, г.зн. поўнасцю супадаюць сваім значэннем» [2, с. 27]. Напрыклад, *бобóк – бобóвнык, гýска – гýсочка, жáбскэ молокó – жáбчэ молокó* і г.д. Падобныя словы з'яўляюцца рознымі мадыфікацыямі адной і той жа лексемы (яны не парушаюць тоеснасці слова), г.зн. яго словаўтваральнымі варыянтамі.

Т. Юхо словаўтваральнымі варыянтамі лічыць «аднакарэнныя словы-варыянты з тоесным ці блізкім лексічным значэннем, у якіх суфіксальныя элементы выконваюць ролю толькі гукавых дыферэнцыятараў слова» [4, с. 37]. Адзначым, што П. Сцяцко падобныя дэрываты, «якія поўнасцю дублююць семантыку базавага слова і адрозніваюцца ад апошняга толькі структурна», адносіць да словаўтваральных дублетаў [8, с. 45].

Да словаўтваральных варыянтаў мы адносім аднакаранёвыя назвы, якія адрозніваюцца паміж сабой словаўтваральнымі элементамі, але не маюць ніякіх семантычных адценняў, характарызуюцца аднолькавай спалучальнасцю і поўнасцю супадаюць сваім значэннем: *барві́нок – барві́нэць, вовчакы́ – вовчуны́, волóські горі́х – волóськовы горі́х, выдáк – выдýн, голубы́цы – галубні́цы ёла – ёлкá, жыжýнка – жыжýха, зайцóў шчавэ́й – зáячы шчавýх, Івáнава кроў – Івáнкава кроў, кобырня́к – кобыльню́х – кобыльне́к, ню́хнікі – ню́хтыкі, пастухóва сýмка – пастýша сýмка, сі́фка – сі́янка, слывкы́ – слывочкы́, шчавýх – шчавэ́й, ялóвец – ялóўнык.*

У дадзенай групе словы ў парах адрозніваюцца ў асноўным суфіксамі (*выдáк – выдýн* і інш.) і рэдка – прыстаўкамі (*подорóжнык – прыдорóжнык, повітýха – прывітýха* і інш.).

**Заключэнне**

Такім чынам, разнастайныя варыянтныя назвы зафіксаваны да 238 відаў раслін. У складзе заходнепалескіх батанічніх намінацый адзначаецца фанетычная, акцэнтная, акцэнтна-фанематычная, марфалагічная, фанетыка-марфалагічная і словаўтваральная варыянтнасць. Асаблівай прадуктыўнасцю пры гэтым вызначаецца фанетычная варыянтнасць. Значная колькасць варыянтаў можа быць абумоўлена захаваннем у заходнепалескіх гаворках рэштак разнастайных фанетычных працэсаў, што адбываліся ў мове на працягу мінулых стагоддзяў, вуснай формай бытавання дыялектнай мовы, уплывам рускай мовы і гаворак памежных тэрыторый, распаўсюджаннем агульнапрынятых навуковых намінацый раслін. Калі для навуковай тэрміналогіі і наменклатуры з'ява варыянтнасці з'яўляецца непажаданай і адмоўнай, то яе пашырэнне ў дыялектах гаворыць пра самабытнасць мовы кожнага рэгіёна і народнай мовы ўвогуле.

Заходнепалеская батанічная наменклатура – гэта арыгінальная і разнастайная група народнай лексікі. Комплекснае апісанне дадзеных найменняў можа садзейнічаць

вырашэнню пытанняў фарміравання, упарадкавання і нармалізацыі сучаснай навуковай наменклатуры раслін.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Абрамова, Е. И. Паралельные синонимические ряды в русском и белорусском языках : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Е. И. Абрамова. – Минск, 1990. – 203 л.

2. Красней, В. П. Аб сінонімах, дублетах і варыянтах у тэрміналогіі / В. П. Красней // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. – 1995. – № 1. – С. 25–27.

3. Шкраба, І. Р. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове / І. Р. Шкраба. – Мінск : Асар, 2004. – 240 с.

4. Юхо, Т. І. Словаўтваральныя варыянты назоўнікаў, якія абазначаюць жывых істот (птушак, жывёл) у сучаснай беларускай літаратурнай мове / Т. І. Юхо // Беларус. лінгвістыка. – Мінск, 1981. – Вып. 19. – С. 37–42.

5. Юхо, Т. И. Словообразовательные варианты имён существительных в современном белорусском языке : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / Т. И. Юхо ; Акад. наук БССР, Ин-т языкознания им. Я. Коласа. – Минск, 1981. – 20 с.

6. Булаховский, Л. А. Введение в языкознание : в 2 ч. / Л. А. Булаховский. – М. : Учпедгиз, 1954. – Ч. 2. – 177 с.

7. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.

8. Сцяцко, П. У. Субстантыўныя словаўтваральныя дублеты ў беларускай народнадыялектнай мове / П. У. Сцяцко // Беларус. лінгвістыка. – Мінск, 1978. – Вып. 12. – С. 45–53.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.02.2019

***Kisel T.A.*** **The Variation of the West-Polesye Names of Plants**

*In the article the various approaches to the definition of variation, synonymy and double concepts in modern Belarusian linguistics are discussed. The phenomenon of variability using the example of the West-Polesye plant names is analyzed and possible causes of its genesis are revealed. Phonetic, accent, accent-phonemic, morphological, phonetic-morphological, and word-formative variations of botanical names in the West-Polesye dialects are recorded, numerous examples are given. Phonetic variation among the analyzed units is characterized by special productivity.*